Вольга Басько

супрацоўнік аддзела традыцыйнай культуры
і аматарскай творчасці
Інстытута культуры Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

# Рытуальныя абыходы на Беларусі ў час сустрэчы вясны

У структуры традыцыйнага народнага календара адно з значных месц займаюць пераходныя абрады сезоннага круга — каляндарнага рубяжа — абрады летняга і зімняга сонцапавароту, вясенняга і асенняга раўнадзенства. У народзе ім надавалася асаблівая ўвага.

Зварот да рытуальных абыходаў вёсак, двароў, палёў, аднаго з пашыраных элементаў веснавога святочнага каляндарна-абрадавага комплексу на Беларусі не выпадковы.



Аналіз і вызначэнне ступені іх захаванасці ў актыўнай ці пасіўнай форме і неабходнасці рэканструявання і ўзнаўлення ў лакальнай культуры дасць больш дэталёвае і аб'ектыўнае разуменне працэсаў трансфармацыі і развіцця святочна-абрадавых традыцый гэтага перыяду.

Рытуальныя абыходы ў народным календары рэгулявалі (выконвалі) гаспадарчую, сацыяльна-ахоўную і культурную функцыю жыццядзейнасці соцыуму. Яны, як правіла, былі арыентаваны на пераход да новага стану прыроды. Сімвалічныя формы паводзін і дзеянні вяскоўцаў у такі перыяд набывалі больш высокі статус у параўнанні з паўсядзённым.

Веснавыя рытуальныя абыходныя практыкі — вылананне веснавых карагодаў, песень-заклічак, прыгавораў сімвалізавалі магічныя дзеянні, скіраваныя на хутчэйшы надыход вясны і на дабрабыт усяго вясковага калектыву.

У дадзеным артыкуле разглядаюцца абыходныя рытуальныя практыкі, звязаныя з наступленнем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сустрэчай вясны. Апошнія навуковыя даследаванні па народным календары, праведзеныя навукоўцамі, этнографамі, этнамузыколагамі і фальклapыстамі ў Беларусі сведчаць аб іх наяўнасці ў Цэнтральнай Беларусі, на Палессі і Падняпроўі. У Беларусі вясну сустракалі ў розны час ці «пелі вясну» ў розныя тэрміновыя рамкі.

У Салігорскім раёне гукалі вясну на Благавешчанне карагодам ля кожнага двара. Такім чынам у спалучэнні слова і руху выконвалі магічную рытуальную функцыю — дабрабыт кожнай сям'і на ўвесь год («Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць»). У в. Хорастава Мінскай вобласці ў 1997 г. Л. П. Барабанавай зафіксаваны звычай «заскаквання», «затанцоўвання» вясны — рытуальны абыход кожнага двара: «Моладзь збіралася гуртам і ішла ў канец вёскі, адкуль пачынаўся абыход усіх двароў. Ля кожнага двара закружваўся карагод. Гаспадарам жадалі добрага ўраджаю, дабрабыту, каб стагі стаялі на двары» (Барташэвіч Г. А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. — Мінск, 1985. — С. 24).

Рытуальны абыход у час гукання вясны зафіксаваны Г. А. Барташэвіч (1975 г.) у Чэрвеньскім раёне ў в. Клінок Мінскай вобласці. На Благавешчанне дзяўчаты хадзілі ад хаты да хаты пад акно і пыталі: «Ці трэба вам вясна-красна», пыталі дазволу вясну гукаць. А тады ішлі да ракі і пелі вясну.

Удзельнікамі рытуальных абыходаў сустрэчы вясны ў адных мясцовых традыцыях былі дзяўчаты, моладзь, у другіх — дзеці і падлеткі.

На Гомельшчыне рытуальны абыход «Гу! Вясна!» (у апошні дзень Масленіцы, на запускі) здзяйснялі з ёлачкай, упрыгожанай кветкамі з рознакаляровай паперы і лентамі. Рытуалу спадарожнічала абрадавая ежа. «Колись гукали. Девочки сбираюца, идуть у гумно, поють. Робили квасы от клюквы, дёуки наварать борщч, кашу. И весновали ходили. Робили ёлки, квитками украшали. Наверх свечку ставим. З тыя ёлкай запрагали волы и ездили по дерэуне... Это весняна гульба называеца» [ПА, Симоничи Лельчицкого р-на Гомельской обл.]. (Агапкина Т. А. Этнографические связи календарных песен. Встреча весны в обрядах и фольклоре восточных славян. — М. : Издательство «Индрик», 2000. — С. 20—21).

Адзін з архаічных абыходных рытуальных абрадаў сустрэчы вясны, які найбольш поўна захаваўся на Палессі як жывая традыцыя з'яўляецца абрад «Сула» в. Маркавічы Гомельскага раёна.

Па выніках праведзенага экспедыцыйнага даследавання Гомельскага раёна па каляндарнай абраднасці ў 2009 г. В. І. Басько, гэты абрад яшчэ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зафіксаваны ў вв. Гадзічава, Дзікалаўка, Краўцоўка, Сямёнаўка.

«Сула» мае больш пашыранае распаўсюджанне на тэрыторыі Украіны. Гэта не выпадкова, у пераважнасці этнакультурная традыцыя веснавой абраднасці на Украіне — карагодная. Маркавічы — вёска, што знаходзіцца на паўднёва-ўсходнім памежжы Украіны і Беларусі. Яе жыхары і сёння з’яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі абраду. На ваджэнне «Сулы» ў Маркавічы прыязджаюць жыхары в. Гарнастаеўка з Украіны.

Абрад спраўляецца кожны год на другі дзень Вялікадня, пасля поўдня, калі людзі ўжо вярталіся з царкоўнай святочнай службы, што надавала яму статус рытуальнага абыходу. З таго часу ў гэтай мясцовай традыцыі пачыналі пець вясну.

Вось як аб абрадзе паведамілі носьбіткі традыцыі в. Маркавічы С. Ф. Рабіца (1929 г. н.) і Е. Ф. Цуцукова (1926 г. н.).

«Мы ідом зрання ў цэркаў і ў цэркві ўжэ там згаварваемся ўсе, — будам Сулу весці, Гадзічаў (жыхары в. Гадзічава. — *В. Б.*) нам так гаворыць. — Такая шла “сула”, людзей, шо із кілометру забіраецца аднымі людзямі да дзяцьмі, бяжаць і дзеці ўсе, і людзі ўсе ідуць, і на самы канец сяла. Это на другі дзень Паскі ў нас так. Сабіраемся ўсе ў канцы сяла і там танка водзім. Ішлі бабы такія маладыя, дзевак жа было тагды багата, мужчыны, а дзяцей шчэ болей, і ідуць, і пяюць, і танцуюць, а гармошка іграе, весяляцца ўсе. А пелі ўсякія народныя песні. Пелі ж усё так: “Ой ішла "сула" да ўздоўж сяла, да — гу! Да во так, во ўсяк крычалі. Веснавыя пелі песні, вот "гурочкі"”. Ішлі па “суле” і пелі “Пасею гурочкі...”:

Посею гурочкі
Блізко над водою,
Сама буду поліваці
Дробною слезою.
Расціце гурочкі,
Шырокі лісточкі,
Не бачыла я мілога
Чатыры гадочкі.

Сулу вядуць і цяпер, дак кружнуцца кала клуба, а чаго нам сюды не правесці? І па нашай вуліцы, то і мы б пашлі. У нас эта традыцыя адпадае і яе некаму абнаўляць. У нас ужэ хаты пустыя, паўміралі ўсе, штоб была маладзёж, дак вадзілі б» (запіс В. І. Басько, 2009 г.).

Рытуальна-магічнай мэтай «Сулы» было праз выкананне вербальных тэкстаў (песень, прыгавораў) і магічнага дзеяння ваджэнне танка, забяспечыць будучы ўраджай збажыны і гародніны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Вот на нашам краю сяла сабяруцца бабы, “сулу” тут у нас паводзяць, танка этага. Давайце, кажа, карагоды паводзім, каб капуста радзіла, а тады ідуць ужэ туды далей і па ходу этай дзярэўні каля кожнага двара. Под рукі пабяруцца радамі, ідуць і пяюць, не так жа, што так як мяцеліца, адна там, адна там, а радамі. А Сямёнаўка тры кілометры, а адтуль ужэ прыходзяць сюды ў Краўцоўку.

Толькі во, у Дзікалаўку ўходзяць, і крайнія хаты, тут стол стаіць, прама на вуліцы стаіць. На стале ўжэ стаяць тарэлкі, там павыносілі пірагі, яйкі, устракаюць іх, ужэ прывествуюць, там ужэ па-трошку дадуць усім і тагды пашлі ўжэ і дзікаляне і ўсе туды на край, лужок такі, ля жыта, ну і там скрозь ужэ гулянка была. А па сваёй дзярэўні ета проста самі, пака шчэ “сула” не падыйшла, дак яны там паводзяць ужэ карагод, на адном участку сабярэцца кумпанія, колькі там ужэ пакружацца, папяюць, на другом, а тагды як ідуць ужэ дак не астанаўліваюцца, пад песнямі ідуць і пайшлі на Дзікалаўку. Пяюць:

Як ішла страла
Да й удоўж сяла,
Ой ці я ж велю,
Да й удоўж сяла.
Да ўбіла ж страла
Добрага моладца,
Ой ці я ж велю
Добрага моладца.
Па том моладцу
Некаму ж плакаць,
Ой ці я ж велю,
Некаму плакаць.
Мамка старая,
Сястра малая,
Ой ці я ж велю,
Сястра малая.
Ох мамка плачэ
Да век до веку,
Ой ці я велю,
Да век до веку.
А сястра плачэ
Да год до году,
Ой ці я ж велю,
Да год до году.
А жонка плачэ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзень да абедзейка,
Ой ці я ж велю
Дзень да абедзейка.
А паабедаўшы
На ёлку пайшла,
Ой ці я ж велю
На ёлку пайшла.
На ёлку пайшла,
Другога найшла,
Ой ці я ж велю,
Другога найшла.

Это веснавыя ўжэ песні называюцца святочные, што я вам вот расказвала. Першую песню пелі “Як на нашай вуліцы”» (В. П. Анохава, 1924 г. н., в. Краўцоўка, Гомельскі раён; запісана В. І. Басько, 2009 г.).

Абыходнае шэсце па вёсцы, па ўсіх вуліцах, выхад да жыта, ваджэнне танкоў магічнай формы — круга, шчыльная шарэнга ўпоперак вуліцы і спяванне «сулы», у другіх варыянтах «стралы», надае рытуальна-абыходнаму абраду, ва ўяўленнях вяскоўцаў, магічную сілу, і вяскоўцы вераць у гэтую сілу «сулы», у час экспедыцыі яны выказвалі незадавальненне, што «сула» (2009 г.) не пайшла па іх вуліцы, а толькі прайшла каля клуба.



Тэматыка песень «сулы» звязваецца ў свядомасці людзей з клопатам аб іх лёсе, сям’і, дабрабыце. Страла ў народных уяўленнях лічыцца зброяй самаго Бога-Перуна, і гэта ўяўленне, падсвядома, захоўваецца яшчэ і сёння, вяскоўцы вераць, што «сула» можа паўплываць на іх дабрабыт.

Сёння ў вучоным свеце пашырана абмяркоўваецца праблема неабходнасці асэнсавання асаблівасцей і заканамернасцей развіцця нацыянальнай культуры, магчымасцей выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасным этнакультурным кантэксце. Павышаная ўвага да каляндарных свят і абрадаў у апошнія дзесяцігоддзі абумоўлена актыўным зваротам грамадства да хрысціянскай веры, да Царквы, узрастаючай цікавасцю да гістарычнай і этнакультурнай спадчыны. Многія даследчыкі лічаць каляндарную абраднасць «энцыклапедыяй народных ведаў аб сусвеце».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ